### *II Міжнародныя Шамякінскія чытанні «Пісьменнік – Асоба – Час»*

20–21 кастрычніка 2011 года адбыліся II Міжнародныя Шамякінскія чытанні «Пісьменнік – Асоба – Час». Арганізатарам канферэнцыі выступіла кафедра беларускай літаратуры ўніверсітэта, якая займаецца праблемамі развіцця беларускага мастацкага слова ў кантэксце рэгіянальнага і агульначалавечага быцця. У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел навукоўцы з Беларусі, Расіі, Украіны, Азербайджана.

Да пачатку канферэнцыі быў выдадзены зборнік яе матэрыялаў, які адлюстраваў змест і праблематыку выступленняў.

На пленарным пасяджэнні з прывітальным словам да ўдзельнікаў канферэнцыі звярнуўся прарэктар па вучэбнай рабоце УА «Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна», кандыдат сельскагаспадарчых навук, дацэнт М. А. Лебедзеў.



Найбольшы інтарэс выклікалі даклады *В. А. Ляшчынскай*, доктара філалагічных навук, прафесара УА «ГДУ імя Ф. Скарыны» (Гомель, Беларусь); *А. М. Ненадаўца*, доктара філалагічных навук, прафесара, загадчыка кафедры грамадскіх дысцыплін і права Бабруйскага філіяла УА «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт» (Бабруйск, Беларусь); *В. В. Шура*, доктара філалагічных навук, прафесара, загадчыка кафедры беларускага мовазнаўства УА «Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна»; *А. Я. Барсук*, кандыдата гістарычных навук, дацэнта, намесніка дэкана філалагічнага факультэта па навуковай рабоце (Мазыр, Беларусь).

На секцыйных пасяджэннях канферэнцыі былі абмеркаваны наступныя праблемы:

– творчасць і літаратурна-грамадская дзейнасць І. Шамякіна ў кантэксце XX стагоддзя;
– літаратурныя генерацыі XX–XXI стст.: эстэтычна-аксіялагічныя пошукі;
– нацыянальны вобраз свету праз прызму часу і новыя культурныя парадыгмы;
– сучасны літаратурны працэс: праблемы зместу і формы;
– творчасць І. Шамякіна і праблемы выкладання літаратуры ў школе і ВНУ;
– беларуская літаратура ў жывапісе, кіно і тэатральным мастацтве;
– мова і стыль мастацкай літаратуры;
– актуальныя праблемы сучаснай лінгвістыкі.

Адным з накірункаў работы канферэнцыі была праблема «Сучасны літаратурны працэс: праблемы зместу і формы» (кіраўнік секцыі – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай мовы і сусветнай літаратуры УА «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт» *Т. М. Федарцова*). У абмеркаванні праблем развіцця беларускага і сусветнага мастацтва слова на сучасным этапе ўдзельнічалі вучоныя з УА «БрДУ імя А. С. Пушкіна», УА «ГрДУ імя Я. Купалы», УА «ГДУ імя Ф. Скарыны» і інш.

На другі дзень канферэнцыі падчас круглага стала адбыўся абмен думкамі адносна шляхоў далейшага навуковага супрацоўніцтва, вызначаны навукова-даследчыя прыярытэты чарговых Міжнародных Шамякінскіх чытанняў.

*А. У. Сузько,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*загадчык кафедры беларускай літаратуры*

МГПУ им. И.П. Шамякина